**1 варыянт**

1**.** *З наступнымі словамі складзіце па два словазлучэнні так, каб у першым выпадку слова ўжывалася ў прамым значэнні, у другім – у пераносным.*

Зялёны, мяккі, залаты, жалезны, сакавіты.

2. *З наступнымі словамі складзіце словазлучэнні так, каб была відавочна розніца ў значэнні гэтых слоў.*

Ганарысты – ганаровы, эфектны – эфектыўны.

3. *У наступных сказах выпраўце моўныя памылкі. Запішыце сказы правільна.*

1) Характар у хлопца павольны, упэўнены ў сабе. 2) Усё прагрэсіўнае чалавецтва свету падтрымала мірную ініцыятыву. 3) Васіль Быкаў зрабіў шмат твораў пра вайну.

4. *Растлумачце наступныя фразеалагізмы*. Апусціць рукі, блытацца пад нагамі, абое рабое, мазоліць вочы, на адзін капыл.

5. *Складзіце з дадзенымі фразеалагізмамі сказы.*Апусціць рукі, блытацца пад нагамі, абое рабое, мазоліць вочы, на адзін капыл.

**2 варыянт**

1. *З наступнымі словамі складзіце па два словазлучэнні так, каб у першым выпадку слова ўжывалася ў прамым значэнні, у другім – у пераносным.*

Халодны, прамы, светлы, шаўковы, ледзяны.

2. *З наступнымі словамі складзіце словазлучэнні так, каб была відавочна розніца ў значэнні гэтых слоў.*

Пісьменны – пісьменніцкі, цікавы – цікаўны.

3. *У наступных сказах выпраўце моўныя памылкі. Запішыце сказы правільна.*

1)Пісьменная дзейнасць Якуба Коласа ўразіла мяне. 2) Упершыню Галіну Мікалаеўну я ўбачыла не ў клініцы, а на раённай Дошцы гонару. 3) На экскурсіі была большая палова класа.

4. *Растлумачце наступныя фразеалагізмы*. Кляваць носам, губы надзьмуць, зарубіць на носе, сунуць нос, душа ў душу.

5. *Складзіце з дадзенымі фразеалагізмамі сказы.*

Кляваць носам, губы надзьмуць, зарубіць на носе, сунуць нос, душа ў душу.

**3 варыянт**

1. *З наступнымі словамі складзіце па два словазлучэнні так, каб у першым выпадку слова ўжывалася ў прамым значэнні, у другім – у пераносным.*

Тонкі, пусты, сухі, цвёрды, востры.

2. *З наступнымі словамі складзіце словазлучэнні так, каб была відавочна розніца ў значэнні гэтых слоў.*

Гліняны – глiністы, адрасат – адрасант.

3. *У наступных сказах выпраўце моўныя памылкі. Запішыце сказы правільна.*

1) Жылі яны тады ў шматпавярховай хаце. 2) Своечасовыя эфектныя меры выратавалі становішча. 3) Выкананне гэтага задання патрабуе асабовай увагі.

4. *Растлумачце наступныя фразеалагізмы.* Хадзіць на галаве, як кот наплакаў, задаваць тон, на адзін зуб, арыядніна нітка.

5. *Складзіце з дадзенымі фразеалагізмамі сказы.*Хадзіць на галаве, як кот наплакаў, задаваць тон, на адзін зуб, арыядніна нітка.